**Матырка, В.** Макавыя плантацыі / В. Матырка // Лепельскі край. — 2010. — 26 лют. — С. 5.

# МАКАВЫЯ ПЛАНТАЦЫІ



Напярэдадні Дня вываду савецкіх войскаў з Афганістана карэспандэнт сустрэўся з ветэранам-афганцам падпалкоўнікам запасу Алегам Хрыпавым. Зараз ён жыве ў Заслонаве, узначальвае мясцовую арганізацыю беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане, а ў канцы 80-х быў намеснікам камандуючага 40-ой арміі па тыле, займаўся забеспячэннем вываду войск. Гутарылі пра многае, сярож іншага закранулі такую вострую тэму, як наркатрафік у Афганістане.

***– Што для афганцаў наркотык?***

Алег Барысавіч усміхнуўся, у вачах яго прамільгнула хітрынка:

– Уяві сабе такую неверагодную сітуацыю: беларусам забаранілі есці бульбу. Знайшлі ў ёй нейкія шкодныя рэчывы і забаранілі.

***– Гэта немагчыма! Гэта ж наш нацыянальны прадукт!***

– Вось так і афганцы адносяцца да анашы і гашыша. Гэта легкія наркотыкі, якія афганцы кураць, атрымліваюць легкі кайф. У далейшым з іх робяць гераін – моцны прэпарат са стопрацэнтным прывыканнем. Але мясцовыя жыхары гэтым не займаюцца, ім хапае легкіх, а гераін ідзе “на экспарт”.

***– Што служыць асновай для вытворчасці гэтых наркотыкаў?***

– Афганістан – краіна з ідэальнымі кліматычнымі ўмовамі для росту маку як у дзікім стане, так і для вырошчвання яго на плантацыях. Калі ен цвіце – пейзажы незабыўныя, схілы полымем гараць. Каб не вайна, афганскія даліны былі б меккай для мастакоў-пейзажыстаў – такая прыгажосць. Маку ў Афганістане не проста многа, а неймаверна шмат, да паловы краіны зарастае дзікім макам. Знішчаць яго – усё роўна што вычэрпваць ваду вядром з бурлівай ракі. Мясцовае насельніцтва адносіцца да маку як да звычайнай карыснай расліны.

*******

Савецкім войскам непасрэдна наркотыкі вялікай небяспекі не неслі. Праўда, лёгкае курыва там пакаштавалі многая, а вось падселі на шпрыц - адзінкі. Для нас яны ўяўлялі іншую пагрозу – за наркотыкі, дакладней, за грошы ад іх рэалізацыі душманы куплялі зброю і боепрыпасы, вебавалі наёмнікаў, таму барацьбе супраць зелля стала надавацца ўсё большае значэнне.

Змагаліся мы такім чынам: рабілі засады на горных снежках з мэтай перахопу караванаў з наркотыкамі ў Пакістан і са зброяй – у Афганістан. Перахоплівалі такія партыі, на сённяшні час дух захапіла б, падлічыўшы іх кошт. З цягам часу наладзілі разведку і супрацоўніцтва з мясцовым насельніцтвам і афганскімі ўрадавымі спецслужбамі і арміяй. Даходзіла да таго, што ў некаторых сектарах душманы адмаўлял-ся пускаць свае караваны, абыходзілі іх, але ўсё роуна не уратоуваліся. А ведаеш, у чым розніца антынаркатычнай барацьбы нашай у 80-ыя і амерыканскай зараз? У альтэрнатыве. Не трэба забываць сацыяльныя і эканамічныя прычыны наркавытворчасці.

Амерыканцы зараз выдзяляюць на інвестыцыі ў афганскую эканоміку зусім мізэрныя грошы, а Савецкі Саюз аказваў паўнавартасную эканаміч-ную дапамогу. Дык вось, гледзячы на тое, што, з аднаго боку, наркагандлю была пастаўлена надзейная заслона савецкімі войскамі, а з другога боку, давалася вялікая дапамога ў пераарыентацыі гаспадаркі, многія афганцы пераключаліся з вырош-чвання маку на вырошчванне вінаграду, збожжавых, бахчавых культур. Савецкі Саюз для гэтага выдзяляў Афганістану сельскагаспадарчую і іншую тэхніку, насенне, мінеральныя ўгнаенні. За гады знаходжання ў Афганістане савецкіх войскаў паток наркотыкаў скараціўся ў разы. Самае ж галоўнае – простыя людзі ўбачылі і адчулі, што можна жыць няблага, годна, карміць сваю сям'ю і пры гэтым не займацца наркотыкамі.

Калі на афганскую зямлю прыйшлі талібы, вытворцы наркотыкаў у першыя ж гады навярсталі тое, што страцілі за гады савецкай прысутнасці, нават з вялікім лішкам. Яны стваралі вялікія, нават прамысловыя магутнасці па вытворчасці гераіну, сталі наладжваць шляхі экспарту, у тым ліку былі спробы асвоіць каналы транзіту праз краіны былога СССР.

**Васіль Матырка**